ную зону (штаб і Слуцкая рада былі размешчаны ў мястэчку Семежава), у канцы лістапада 1920 г., складаў 4 тысячы чалавек; потым пабольшыўся і разам з рэзервам усяго было 10 тысяч чалавек. Зброі на усіх не хапала. Спачатку было 500 вінтовак, што прынеслі паўстанцы, і 300 карабінаў, перададзеных польскімі уладамі. Але хутка выявілася, што гэтыя карабіны для баеў непрыдатныя: у іх наўтыска былі збіты мушкі і прыцэлы. Потым у брыгадзе было ўжо 2000 вінтовак і 10 кулямётаў, у тым за кошт трафеяў. Брыгада была пяхотнай. Такім чынам, за некалькі дзён было створана вайсковае аб'яднанне рэгулярных войск Беларускай Народнай Рэспублікі.

Баявыя дзеянні брыгады доўжыліся цэлы месяц – з 27 лістапада да 28 снежня 1920 г. Войскі Чырвонай арміі (са згоды польскіх улад) увесь час заходзілі на тэрыторыю нейтральнай зоны, нават на польскі бок. Некаторыя мястэчкі (Семежава, Вызна) і вёскі пераходзілі з рук у рукі на некалькі разоў. Урэшце з-за перавагі чырвоных войск і недахопу зброі, боепрыпасаў і харчавання. Пасля пераходу праз раку Лань на тэрыторыю, кантралюемую польскімі войскамі, салдаты і афіцэры Слуцкай брыгады былі разброены і інтэрнаваны ў лагерах: спачатку ў раёне Сіняўкі, потым у Беластоку і Дарагуску. Яны былі вызваленыя польскімі уладамі толькі ў маі 1921 г., ужо пасля падпісання канчатковага мірнага дагавору паміж Савецкай Расіяй і Польшчай.

У акрэсе гістарычнага лёсу Беларусі пачатку XX стагоддзя Слуцкі збройны чын адыграў значную ролю. Гэта быў патрыятычны чын беларускага сялянства і інтэлігенцыі ў барацьбе за незалежнасць Беларусі ў яе этнічных межах, за самастойную дзяржаву з легальнай дэмакратычнай уладай. Ён быў накіраваны супраць ганебнага падзелу тэрыторыі Беларусі паміж Расіяй і Польшчай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## НЕКАТОРЫЯ ПЫТАННІ ВАЙНЫ 1812 г. НА БЕЛАРУСІ

С.Крыуліна

Беларускі народ вельмі часта апынаўся ўплеценым у гушчыню многіх гістарычных падзей. Сярод іх – вайна 1812 года. Пытанне "Беларусь і вайна 1812 г." шматграннае, паколькі на Беларусі і

Літве значная частка шляхты напачатку вітала Напалеона як вызваліцеля ад Расійскага гнету, як прыхільніка адраджэння Вялікага княства Літоўскага. Разам з тым беларускія палякі меліся і ў напалеонаўскай і ў расійскай арміях. Тлумачыцца гэта папярэдняй гісторыяй: у выніку падзелаў Рэчы Паспалітай Вялікае княства Літоўскае ў канцы ХУШ ст. было далучана да Расіі.

24, 25 і 26 чэрвеня (па новаму стылю) армія Напалеона, выслухаўшы пракламацыю імператара: "Салдаты! Другая польская вайна пачалася!", пераправілася праз Неман у раёне Коўна (Кауна), адкуль яе шлях ляжаў на Маскву. 28 чэрвеня Напалеон прыбыў у Вільню, быў цёпла сустрэты мясцовым дваранствам, абвясціў аб адраджэнні Вялікага княства Літоўскага.

У Вільні на трэці дзень пасля прыходу у горад французаў, са згоды імператара, была створана Камісія часовага урада Вялікага княства Літоўскага, якая прысягнула яму на вернасць, гэта значыць, пэўная колькасць беларускіх і літоўскіх магнатаў, хоць і фармальна, але выставілі Беларусь і Літву ў якасці саюзнікаў Францыі. Ад апошніх Напалеон дамагаўся важнай рэальнай дапамогі: харчоў, фуражу, грошай і вайсковых фарміраванняў. Было створана новае кіраўніцтва акупіраванай тэрыторыяй. Губерні былі перайменаваны у дэпартаменты, была створана адміністрацыя дэпартамента. Дэпартаментамі кіравалі французскія губернатары і інтэнданты. Паветы, перайменаваныя ў падпрэфектуры, былі абавязаны паслухмяна выконваць распараджэнні напалеонаўскіх военачальнікаў.

8 ліпеня ў Мінск увайшлі войскі маршала Луі Міколы Даву, якога сустрэлі кветкамі, хлебам-соллю і музыкай. Даву заверыў гараджан ад імя свайго імператара, што французская армія прыйшла вярнуць ім Радзіму. Перад адыходам з горада Даву зацвердзіў складзеную з мясцовых жыхароў камісію часовага праўлення, перайменаваную за тым у Савет адміністрацыі Мінскага дэпартамента.

15 ліпеня ў горад прыбыў назначаны Напалеонам губернатар Мікалай Браніkоўскі, генерал польскіх і французскіх войскаў. У назначэнні яго, паляка па паходжанню, змагаўшагася пад сцягам Касцюшкі, а потым Напалеона, мясцовае дваранства бачыла асобы знак сур'езных намераў Банапарта дапамагчы ім вярнуць Радзіму.

Гарадское жыццё ліпеня-верасня праходзіла у святкаванні усіх перамог французаў. 19 ліпеня пасля урачыстага набажэння ў кафед-

ральным касцеле прадстаўнікі мясцовай улады падпісалі акт Генеральнай Канфедэрацыі, створанай у Варшаве і ўмацоўваўшай у новых гістарычных абставінах саюз Польшы і Вялікага княства Літоўскага.

15 жніўня у Мінску і іншых гарадах урачыста быў адзначаны дзень нараджэння Напалеона. Прайшлі урачыстыя набажэнні у каталіцкіх храмах, агляд войск, спартыўныя гульні. У Мінску, у доме губернатара быў дан святочны абед і маскарад. Горад быў упрыгожаны гербамі "Пагоня" і польскім "Арлом". Сіламі мясцовых тэатралаў была прадстаўлена п'еса "Вызваленне Літвы, ці пераправа праз Неман" мінчаніна Яна Хадзько, пісьменніка і актыўнага дзеяча новай адміністрацыі. У той дзень мінскія улады вырашылі перайменаваць гарадскую плошчу Высокага рынку (зараз плошча Свабоды) у плошчу Напалеона.

Аднак адносіны адміністрацыі і камандавання складваліся не надта добра. Патрабаванні грошай, хлеба, мнагалікія пабора выклікалі незадавальненне сярод мясцовай знаці і жыхароў. Увесь той афіцыйны гоман, арганізаваная радасць мала падмацоўваліся справамі. Так, агульная колькасць створанага на Беларусі і Літве войска складала 23 тыс.чалавек, аднак у баявых дзеяннях Напалеона супраць расійскіх арміі прыняло удзел наўрад ці чвэрць. Адна з прычын: у многіх жыхароў родныя змагаліся на баку расійскай арміі і у выніку вайна ператварылася у вайну супраць сваіх.

Многія сяляне хаваліся у лясах, вялі барацьбу як з марадзёрамі, так і з сваімі панамі. Беларускія сяляне чакалі ад Напалеона скасавання прыгону (як гэта адбылося у 1807 г. у Польшчы) і з пачаткам вайны пачалі адмаўляцца ад прыналежнасці панам. Аднак Банапарт не асмеліўся на вызваленне сялян, наадварот, ён загадваў высылаць каманды для пакарання мяцежнікаў. Натуральна нарадзілася супрацьборства: ці пасіўнае - адказ выконваць пастаўкі, уцекі у лясы; ці актыўнае - забойствы рэквізітараў, партызанскія дзеянні па знішчэнню варожых салдат, захопу правіянцкіх абозаў. Не меншыя страты, чым узброеныя выступленні, наносіў сялянскі сабатаж паставак харчовых прыпасаў для напалеонаўскай арміі: ад голаду салдаты паміралі як ад зброі.

Вайна 1812 г. прынесла беларускаму народу незлічоныя бедствы: былі разбураны многія гарады і вёскі, а некаторыя увогуле знішчаны. І што уражвае - за шэсць месяцаў беларускае насе-

льніцтва отраціла мільен жыццяу, загінуу кожны чацверты.

У выніку вайны амаль напалавіну скарацілася пагалоуе жывелы, у многіх паветах, якія былі акупіраваны французамі, зусім не засталося коней. Прыйшло у заняпад земляробства. Пасяуная плошча у Беларусі у 1813 г. склала толькі 50% даваеннай.

Так закончылася вайна 1812 г., эмяніушая лес Еуропы і ператварыушая у попел надзеі тых, хто бачыу у Напалеоне аднавіцеля ВКЛ.

## АБВЯШЧЭННЕ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ БНР - ВАЖНЫ ЭТАП БАРАЦЬБЫ ЗА НАЦЫЯНАЛЬНУЮ ДЗЯРЖАУНАСЦЬ

У.П.Засінец

1. Незалежнасць абвяшчалася ва умовах нямецкай акупацыі. Згодна з Брэсцкім дагаворам Беларусь для Германіі уяулялася часткай тэрыторыі Расійскай дзяржавы.

2. У адказ на лаяльнасць Рады камандаванне 10 нямецкай арміі дазволіла ей у некаторых пытаннях быць самастойнай. Але падтрымлівалася толькі тое, што не закранала дзяржауных інтарэсау Германіі.

3. Акупацыйны парадак быу вельмі жорсткі. Насельніцтва дабразычлівасці да акупантау не праяуляла. Пайшоушы на супрацоуніцтва з акупантамі, ініцыятары абвяшчэння незалежнасці не маглі разлічваць на разуменне народа, яго афіцыйную падтрымку.

4. Нельга адмаўляць таго, што Рада БНР, Народны Сакратарыят, якія прэтэндавалі на статус заканадаучага і выканаучага органау стварылі пэуную палітычную структуру з зачаткамі дзяржаунай арганізацыі. Яны заявілі аб многіх кроках па рэалізацыі права беларускай нацыі на самастойную дзяржаунасць.

Але ж нацыянальнае самавызначэнне, усталяванне самастойнай дзяржаунасці - гэта не толькі абвяшчэнне тых ці іншых дэкларацый, якімі б захапляючымі яны не былі.

5. Рэспубліка абвяшчалася у этнаграфічных межах пражывання беларусау, але сваю юрысдыкцыю на гэтых тэрыторыях не ажыццяуляла. Дазволу на стварэнне свайго войска немцы так і не далі. Адсутнічала фінансавая сістэма. Гаварыць аб свабодзе, дзяр-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ